# РЫТМА-ІНТАНАЦЫЙНЫ ЛАД ВЕРШАЎ Я. КУПАЛЫ (ЗБОРНІК «ЖАЛЕЙКА»)

**Ю. А. Алейчанка**

«Цяжка, ды і немагчыма ўявіць нас, беларусаў, без Янкі Купалы. Ён наш буквар і энцыклапедыя, песня і сумленне», – пісаў Аляксей Пысін. З гэтым выслоўем нельга не пагадзіцца. Купала валодаў выдатнымі здольнасцямі паэта, драматурга, публіцыста, перакладчыка, грамадскага дзеяча, быў адным з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Першы зборнік Купалы «Жалейка» быў выдадзены ў 1908 годзе ў Санкт-Пецярбургу выдавецкай суполкай «Загляне сонца і ў наша аконца». Змяшчаў ён 95 вершаў 1905-1907 гг. і паэму «Адплата кахання». Беларуская інтэлегенцыя з энтузіязмам успрыняла выхад «Жалейкі». У 17-м нумары «Нашай Нівы» выйшла станоўчая рэцэнзія Владака з Казіміраўкі (Уладзіміра Самойлы) на дадзены зборнік. «Велічыню і гібкасць здольнасці» Купалы, «здатнасць да ўсестаронняга развіцця» адзначае Максім Багдановіч у крытычным артыкуле «Глыбы і слаі» (1911 г.), аднак першыя вершы песняра лічыць «шурпатымі», «слаба апрацаванымі з боку формы і мовы» [1, с. 186].

Вершы «Жалейкі» ствараліся на хвалях рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. У іх адчуваецца непрыняцце паэтам сацыяльнай несправядлівасці, разуменне права сялян на лепшую долю. «“Жалейка” населена беларускімі тыпамі», – піша У. Гніламёдаў [2, с. 23]. Сустракаем тут «бабульку-прадаўшчыцу зёлак», добрага гаспадара Сцёпку Жука, старцаў, сяўца, жней і г.д.

Паэт мяняе настрой ад пераможнага і бадзёрага, гіпербалізуючы казачную моц селяніна («З песень беларускага мужыка») [4, с. 199] да элегічнага, засмучонага, які праяўляецца на фоне лірычных пейзажаў («З песень нядолі») [4, с. 190].

Якія ж вершаваныя памеры паэт абірае для належнага ўвасаблення сваіх думак? Правёўшы неабходныя падлікі, я прыйшла да наступнага выніку (гл. табл.).

Як бачна, у зборніку «Жалейка» вядучае месца займаюць харэічныя памеры. Харэй з рэгулярным чаргаваннем 4-стопных і 3-стопных радкоў налічвае 622 радкі, чатырохстопны харэй – 400 радкоў, трохстопны харэй – 444 радкі (з улікам памера Х3/Я3), харэй з рэгулярным чаргаваннем 4-стопных і 2-стопных радкоў – 24 радкі. Усяго – 1490 радкоў (41% ад агульнай колькасці радкоў зборніка).

*Табліца*

**Размеркаванне рытмікі ў зборніку «Жалейка»**

| Памер | Колькасць вершаваных радкоў | Усяго |
|---|---|---|
| Х4343 | 48; 20; 32; 32; 24; 30; 28; 32; 32; 64; 40; 28; 80; 20; 48; 32; 32 | 622 |
| Х4 | 40; 42; 32; 12; 18; 18; 16; 32; 16; 120; 40; 32 | 400 |
| Х3 | 36; 44; 45; 60; 43; 44; 20; 44; 40; 48 | 428 |
| Х4242 | 24 | 24 |
| Х3Я3 | 32 | 32 |
| Я4 | 24; 30; 28; 54; 48; 45; 44 | 273 |
| Я3 | 44; 48; 34; 20; 20;20; 108 | 294 |
| Я4343 | 18; 8 | 26 |
| Д2 | 40; 104 | 144 |
| Д4/Ан4 | 20 | 20 |
| Ам4 | 28; 15; 72; 16; 16; 108; 36 | 291 |
| Ам3 | 40; 40; 28; 48 | 156 |
| Ам2 | 50; 56; 56 | 162 |
| Ам4343 | 40 | 40 |
| Ан4 | 24; 68; 64; 32; 40 | 228 |
| Ан3 | 28; 24; 24; 32 | 108 |
| Ан2 | 80; 16; 40; 28; 28; 28; 36;32; 28 | 288 |
| Інтанацыйны | 15; 36; 36 | 87 |

В. Рагойша ў сваёй манаграфіі «Беларускае вершаванне» выказваецца аб непрыняцці меркавання пра замацаванасць за пэўным вершаваным памерам толькі адной жанрава-тэматычнай сферы, але прызнае наяўнасць у свядомасці ўспрымальніка пэўнага «эмацыянальна-экспрэсіўнага» стэрэатыпа за тым ці іншым памерам [5, с. 124].

Імклівасць, узбуджанасць, яркая экспрэсіўнасць харэічнай страфы, я лічу, і з'яўляецца падобным стэрэатыпам яе ўспрымання. Аднак у «Жалейцы» харэй мае як мінорную танальнасць, адлюстроўвае неўладкаванасць жыцця, душэўны боль («Кепска») [4, с. 215], так і бадзёры настрой і надзею («Аўтарцы "Скрыпкі беларускай"») [4, с. 126].

Змешаны тып харэя (Х4343) мае, да таго ж, цікавую сэнсава-інтанацыйную дынаміку, заснаваную на прынцыпе антытэзы («Вось тут і жыві») [4, с. 205].

Генетычна гэты вершаваны памер «непасрэдна звязаны з традыцыямі народнай песні, асабліва з яе каламыйкавым відам», – адзначае даследчык М. Грынчык [3, с. 223].

Другое месца ў зборніку належыць ямбічнай кадэнцыі. Чатырохстопны ямб налічвае 273 радкі, трохстопны – 294, ямб з раўнамерным чаргаваннем 4-стопных і 3-стопных – 26 радкоў. Усяго – 593 радкі (16 %).

Ямб успрымаецца даволі ўраўнаважаным. Найчасцей у «Жалейцы» ямб перадае бадзёры і аптымістычны настрой («Песня вольнага чалавека») [4, с. 197].

Але выкарыстоўвае Купала ямб і ў павольнай плыні пейзажных замалёвак у вершах з элегічным настроем («Вольха») [4, с. 87].

Актыўнае засваенне Купалам двухскладовых памераў сведчыць пра «канчатковае ўсталяванне сілаба-танічных прынцыпаў у беларускай паэзіі XX ст.» і «рашаючы уплыў народнай паэзіі на рытмічную структуру нацыянальных форм беларускага верша», як сцвярджае М. Грынчык у манаграфіі «Шляхі беларускага вершавання» [3, с. 124].

На трэцім месцы ў «Жалейцы» чатырохстопны амфібрахій (без уліку паэмы «Адплата кахання») – 291 радок (8%). Амфібрахій блізкі да гутарковай стыхіі беларускай мовы (ананімныя гутаркі, вершы Багушэвіча, Цёткі, Лучыны). Найчасцей ён перадае глыбокія філасофскія роздумы і перакананні («Не рвіся к багатым») [4, с. 69].

Такім чынам, Янка Купала пачынае з засваення найбольш традыцыйных форм сілаба-тонікі (ямба і харэя). Паралельна прыходзіць паэт і да трохскладовых памераў, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізасці да народна-апавядальных традыцый.

У сваіх творчых пошуках Янка Купала, безумоўна, улічваў здабыткі папярэднікаў. Найперш Янкі Лучыны і Францішка Багушэвіча.

Янка Лучына шмат у чым папярэджваў развіццё беларускага вершавання ў пазнейшыя гады, яго бліскучы ўзлёт у пач. XX ст. Сілаба-тоніка (27 вершаў) складае 84% ад яго творчай спадчыны. Перавагу Лучына аддаваў двухскладовым памерам. 12 з 27 яго вершаў напісаны харэем (Х4 – 5 вершаў, Х3 – 3 верша, Х4343 – 3 верша, Х7 – 1 верш).

Францішак Багушэвіч таксама паступова пераходзіў да сілаба-тонікі. У яго «Смыку беларускім» (1894) ужо няма ніводнага сілабічнага твора. Першае месца ў дадзеным зборніку займае Х4343, як і ў «Жалейцы».

Параўнаем рытміку Купалы жалейкавага перыяду з блізкімі па часе зборнікамі М. Багдановіча і Я. Коласа.

М. Багдановіч у зборніку «Вянок» (1913г.) даволі раўнамерна ўжывае асноўныя канстантныя структуры сілаба-тонікі. Я4 (27% ад колькасці радкоў) – найбольш распаўсюджаны памер.

У зборніку «Песні жальбы» (1910) Якуба Коласа, як і ў «Жалейцы», дамінуе змешаны тып харэя (834 радкі), як увогуле і харэічная кадэнцыя з'яўляецца вядучай (Х4 – 608 радкоў, Х3 – 396 радкоў).

Такім чынам, Янка Купала сваім першым зборнікам замацаваў у беларускай паэзіі традыцыі сілаба-тонікі, улічваў пры гэтым вопыт папярэднікаў, еўрапейскія і жывыя народныя традыцыі. Аўтар «Жалейкі» паказаў бязмежнасць тэматычнага поля лірыкі, еднасць з беларускім этнаграфічным светам, характарам народа.

**Літаратура**

1. *Багдановіч М.* Поўны збор твораў: У 3 т. Мінск, 1993. Т.2: Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. 1993.
2. *Гніламёдаў У.* Янка Купала: новы погляд: Дапам. для настаўніка. Мінск, 1995.
3. *Грынчык М.* Шляхі беларускага вершаскладання. Мінск, 1973.
4. *Купала Я.* Поўны збор твораў: У 9 т. Мінск, 1995. Т.1: Вершы, пераклады 1904–1907. 1995.
5. *Рагойша В.* Беларускае вершаванне: вучэб.-метадычны дапаможнік. Мінск, 2011.

# ФИГУРЫ ПРИБАВЛЕНИЯ В АНТИЧНОЙ, ВИЗАНТИЙСКОЙ И СОВРЕМЕННОЙ РИТОРИКАХ: СОПОСТАВИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ

**А. А. Асинович**

Деление словесных фигур на три группы (прибавления, убавления, размещения и перестановки) восходит к Цецилию Калактийскому – римскому оратору времен правления Октавиана Августа (I в. до н. э.). В наше время принята подобная классификация фигур, однако некоторые исследователи предлагают собственные классификации на основании выделенных ими критериев. Предложенные ими классификации не решают всех проблем, связанных с разграничением фигур, поэтому мы примем за отправной пункт нашего исследования античную традицию в интерпретации немецкого исследователя Г. Лаусберга.

Г. Лаусберг определяет фигуры прибавления как «повторение одного и того же и накопление другого» и подразделяет их на фигуры добавления и накопления. Фигуры прибавления в свою очередь описываются им как стоящие в начале, середине или конце фразы, предложения или периода, а также делятся на два типа: фигуры, которые могут стоять рядом или находятся по отдельности [1, с. 80–102].

Сложно сказать, сколько всего существует фигур прибавления, так как разные исследователи приводят разное их количество. Подсчет особенно затрудняется тем, что помимо фигур, распространенных как в наши дни, так и во времена античных риторов (например, плеоназм, анафора, эпифора, хиазм, полисиндетон), встречаются редкие, такие как экзоха, апокойну, параплерома и другие. В «Античных теориях языка и стиля» описываются 16 фигур прибавления [3, с. 263–268], у Г. Лаусберга мы насчитываем 19 [1, с. 80–102].

В ходе нашего исследования мы поставили перед собой задачу сравнить римскую, эллинистическую и византийскую традиции. Материал взят нами из учебника «Наставления оратору» римского ритора Квинтилиана (I в. н. э.) – глава «О фигурах» [4]; а также из трактатов «О тропах» александрийского филолога Трифона (I в. до н. э.) и «О поэтиче-